# Беларуская мова. III клас
# Тэма «Галоўныя і даданыя члены сказа»

## Урок 21. Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа

***Мэты:*** даць агульнае паняцце пра дзейнік, фарміраваць уменне знаходзіць дзейнік у сказе па сэнсавым пытанні; развіваць граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць любоў да прыроды.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя, карткі са сказамі для самастойнай працы.

**І. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна прачытайце сказы, якія вы запісалі дома. Які знак прыпынку вы паставілі ў канцы кожнага сказа? Якое слова падкрэслілі ў кожным сказе? (Звяртаецца ўвага на тое, што ў чацвёртым сказе трэба падкрэсліць два словы *дык няхай*.)

**ІІ. Паўтарэнне.**

***Самастойная праца па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі са сказамі:

> 1. Ці бачылі вы рака? Як дзіўна выглядае рак! Як незвычайна ён поўзае!
> 2. Дзе жывуць ракі? Жывуць ракі ў рэках і азёрах. Чым харчуюцца ракі?
> 3. Уважліва паглядзіце на рака. Ён плавае хвастом наперад. Ракі не даюць забрудзіцца вадзе.
> 4. Шукайце ракаў у вадаёмах з чыстай вадой. Рачны рак выходзіць на паляванне ноччу. У пахмурнае надвор'е паляванне на ракаў пачынайце раннім вечарам.

— Прачытайце сказы, запісаныя на картцы. У кожнай групе сказаў знайдзіце лішні і падкрэсліце яго. (Вучні самастойна выконваюць заданне. Пасля гэтага настаўнік дэманструе на слайдзе прэзентацыі сказы, якія трэба было падкрэсліць. Праводзіцца самаправерка напісанага. Пры неабходнасці ў ходзе франтальнай гутаркі высвятляецца, па якой прымеце былі адабраны сказы ў кожнай групе.)

— Назавіце тыпы сказаў, якія вы ведаеце. Выкарыстайце схему на форзацы падручніка. Прывядзіце свае прыклады сказаў розных тыпаў.

**ІІІ. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Праца па падручніку.***

<u>Практыкаванне 105.</u>

— Прачытайце сказы, дапаўняючы іх патрэбнымі словамі. *(Вучні па чарзе зачытваюць сказы.)* Самастойна перачытайце тэкст. Якую назву можна яму даць? *(Навальніца.)* Запішыце першы сказ. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць сказ у сшыткі.) Пра што гаворыцца ў першым сказе? *(Пра хмары.)* Падкрэсліце гэтае слова адной рыскай.

Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі сказамі.

***2. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 68.

— Што такое дзейнік? На якія пытанні адказвае дзейнік?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

<u>Практыкаванне 106.</u>

— З асобных слоў састаўце прыказку. Чаму так гавораць? Запішыце прыказку. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць прыказку ў сшыткі.) Знайдзіце і падкрэсліце ў сказе дзейнік.

***3. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што дзейнік у сказе падкрэсліваецца адной рыскай.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі на с. 69.

**IV. Замацаванне.**

***1. Праца па падручніку.***

<u>Практыкаванне 107.</u>

— Дапоўніце скорагаворкі патрэбнымі словамі. Назавіце ў сказах дзейнікі. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. (Вучні па чарзе тлумачаць правапіс слоў.) Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць адну са скорагаворак. (Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка скорагаворак.) Запішыце па памяці скорагаворку, якую толькі што расказвалі. (Пасля запісу скорагаворкі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

<u>Практыкаванне 108.</u>

— Прачытайце сказы. Назавіце тыя з іх, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца дзейнікамі. (Дзеці чытаюць па два сказы, выбіраюць другі, трэці, пяты сказы, тлумачаць свой выбар.)

***2. Развіццё маўлення.***

На слайдзе прэзентацыі з'яўляецца частка тэксту:

> Выпадак у лесе
>
> У лесе дзеці ўбачылі старое дрэва з дуплом. Цікава, хто там жыве? Сяргейка кінуў у дупло трэску.
>
> Раптам адтуль ...

— Прачытайце пачатак апавядання. У апавядальных сказах знайдзіце і падкрэсліце дзейнікі.

Вучні чытаюць пачатак тэксту, знаходзяць сярод сказаў апавядальныя, вылучаюць у іх дзейнікі, па чарзе выходзяць да дошкі і падкрэсліваюць іх.

На слайдзе прэзентацыі з'яўляюцца малюнкі:





— Разгледзьце малюнкі і адкажыце, хто жыве ў дуплах дрэў. Які выпадак мог адбыцца з дзецьмі, мяркуючы па пачатку? (Выслухоўваюцца меркаванні вучняў.)

На слайдзе прэзентацыі з'яўляюцца апорныя словы і словазлучэнні:

**а)** выскачыла вавёрка, села на галінку, пазірала з цікавасцю, пачаставалі семачкамі сланечніку, арэшкамі;

**б)** вылецела сава, схавалася ў кроне дрэва, адышлі далей, не хацелі палохаць, начную птушку;

**в)** паказаліся восы, хутчэй адбеглі ад дрэва, асцярожна пайшлі далей, больш не крыўдзілі, лясных жыхароў.

— Выкарыстайце прапанаваныя словы, вусна прыдумайце працяг тэксту.

Заслухоўваюцца розныя варыянты працягу тэксту.

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 109.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе дапоўніць сказы патрэбнымі словамі, знайсці і падкрэсліць у сказах дзейнікі. Падобнае заданне мы рабілі ў класе ўсе разам.

**VI. Вынік урока.**

— Што такое дзейнік? Як падкрэсліваецца ў сказе дзейнік?

## Урок 22. Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа

***Мэты:*** даць агульнае паняцце пра выказнік, фарміраваць уменне знаходзіць дзейнік і выказнік у сказе па сэнсавых пытаннях; развіваць граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць уважлівыя адносіны да сваякоў і знаёмых, культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** карткі з часткамі прыказак.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце першы сказ з дамашняга практыкавання. Якім словам вы яго дапоўнілі? *(Сыраежкі.)* З якім словам у сказе яно сугучнае (рыфмуецца)? *(Сцежкі.)* Назавіце дзейнік у гэтым сказе.

Аналагічна правяраецца правільнасць запісу астатніх сказаў.

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Праца па падручніку.***

Практыкаванне 110.

— Прачытайце сказы, дапаўняючы іх патрэбнымі словамі. (Вучні па чарзе зачытваюць сказы.) Запішыце першы сказ. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць сказ у сшыткі.) Знайдзіце і падкрэсліце ў ім дзейнік. *(Самалёт.)* Што гаворыцца пра дзейнік у сказе? *(Самалёт — што робіць? — **ляціць.**)* Падкрэсліце гэтае слова дзвюма рыскамі.

Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі сказамі.

***2. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 70.

— Што такое выказнік? На якія пытанні адказвае выказнік? Якія члены сказа называюцца галоўнымі?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

***3. Праца са слоўнікавым словам* блішчаць.**

— Сёння мы пазнаёмімся з правапісам слоўнікавага слова *блішчаць*. Вымавіце гэтае слова. Назавіце па парадку гукі ў ім. Колькі гукаў і колькі літар у гэтым слове? Чаму літар у ім больш, чым гукаў? Запішыце слова, арфаграфічна правільна прагаворваючы яго.

Практыкаванне 111.

— Дапоўніце сказы слоўнікавым словам у патрэбнай форме і запішыце іх. Падкрэсліце дзейнік у сказах адной рыскай, а выказнік — дзвюма. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія — у сшытках.) Які са сказаў з'яўляецца прыказкай, а які — народнай прыметай? Як вы здагадаліся? Растлумачце сэнс прыказкі, запомніце народную прымету.

***4. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што выказнік у сказе падкрэсліваецца дзвюма рыскамі.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі на с. 71.

**III. Замацаванне.**

***1. Праца па падручніку.***

Практыкаванне 112.

— Прачытайце загадку-пытанне, назавіце слова-адгадку. *(Пісьмо, паштоўка.)* Складзіце па пытанні апавядальны сказ, у якім дзейнікам будзе гэтае слова. *(Пісьмо вандруе ў канверце па ўсім свеце* або *Паштоўка вандруе ў канверце па ўсім свеце.)* Запішыце сказ, падкрэсліце ў ім галоўныя члены. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія — у сшытках.)

***2. Развіццё маўлення.***

— Для чаго людзі дасылаюць лісты, паштоўкі сваякам і знаёмым? Разгледзьце паштоўкі на малюнку ў падручніку. Якія сказы запісаны на іх? *(Клічныя.)* Перад якімі святамі дасылаюць кожную з гэтых паштовак? Якія яшчэ лісты і паштоўкі, акрамя папяровых, можна дасылаць людзям? *(Электронныя.)* Якія сродкі сувязі можна выкарыстоўваць для гэтага? *(Тэлефон, інтэрнэт.)*

Практыкаванне 113.

— Паслухайце і адгадайце загадку: хто ў дупле без спешкі лушчыць шышкі ды арэшкі [1]?

Ці даводзілася вам частаваць вавёрку? Чым можна пакарміць гэтага звярка?

— Прачытайце тэкст. (Вучні ланцужком чытаюць тэкст.) Чым уразілі вас паводзіны звяркоў? Знайдзіце і прачытайце тую частку тэксту, у якой змешчана апісанне незвычайных паводзін вавёрак. (Адзін з вучняў чытае другую частку тэксту.) Выпішыце з кожнага прачытанага сказа галоўныя члены. (Вучні па чарзе чытаюць сказы другой часткі тэксту, называюць у іх дзейнік і выказнік, запісваюць граматычную аснову кожнага сказа ў сшытак.)

— Вусна перакажыце гэтую частку тэксту. Выкарыстайце запісаныя спалучэнні слоў. (Заслухоўваецца выбарачны пераказ тэксту, падрыхтаваны 1–2 вучнямі.)

Практыкаванне 114.

На дошцы вывешваюцца часткі прыказак, прапанаваныя ў практыкаванні.

— З прапанаваных частак састаўце прыказкі. Калі так гавораць? (Тыя вучні, якія правільна складаюць прыказкі, выходзяць да дошкі і аднаўляюць іх.) Падкрэсліце ў кожнай прыказцы галоўныя члены сказа. Растлумачце правапіс выдзеленых літар. (Вучні па чарзе падыходзяць да дошкі, падкрэсліваюць у сказах галоўныя члены, тлумачаць правапіс літар ***о, э — а, е, ё — я***.)

Практыкаванне 115.

— З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. У кожным сказе падкрэсліце дзейнік і выказнік. (Навучэнцы па чарзе складаюць сказы з асобных слоў і запісваюць іх. Адзін вучань працуе каля дошкі, тлумачыць правапіс літар, якія ўставіў у словы.) Перачытайце сказы. Што яны ўтвараюць? *(Тэкст.)* Якую назву можна даць тэксту? (Заслухоўваюцца прапановы некалькіх вучняў *(«Восенню», «У асеннім лесе» «Ясным асенннім днём»).* Вучні тлумачаць свой выбар.)

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 116.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам трэба будзе вызначыць межы сказаў у тэксце і правільна запісаць яго. У кожным сказе неабходна будзе знайсці і падкрэсліць галоўныя члены.

**V. Вынік урока.**

— Якія члены сказа называюцца галоўнымі? Што такое выказнік? Як ён падкрэсліваецца ў сказе?

## Урок 23. Даданыя члены сказа

***Мэты:*** удасканальваць уменне вызначаць граматычную аснову сказа, вучыць вызначаць словы ў сказе, якія пашыраюць дзейнік і выказнік, развіваць уменне пашыраць аснову сказа іншымі словамі; развіваць лагічнае мысленне, граматычны лад маўлення навучэнцаў, уменне працаваць са схемамі сказаў; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі з тэкстам для слоўнікавай працы, са спалучэннямі слоў.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Колькі сказаў у тэксце, якія вы запісалі дома? Прачытайце першы сказ. Назавіце ў ім дзейнік і выказнік. (Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі сказамі.) Як называюцца дзейнік і выказнік?

**II. Паўтарэнне вывучанага матэрыялу.**

***Слоўнікавая праца.***

На дошцы запісаны вобразны выраз і прымацаваны карткі са спалучэннямі слоў:

**толькі пяткі** ____________

| | | |
|---|---|---|
| уцякаць вельмі хутка | бегчы павольна | ісці пешшу |

— Дапоўніце вобразны выраз слоўнікавым словам, з якім мы пазнаёміліся на мінулых занятках. (Той з вучняў, хто першым называе слова, выходзіць да дошкі і запісвае яго.) Як вы думаеце, якое значэнне мае вобразны выраз? Карыстайцеся карткамі-падказкамі. (Вучань, які першым дае правільны адказ на пытанне, выходзіць да дошкі, злучае фразеалагізм з яго значэннем і прыбірае карткі з лішнімі спалучэннямі слоў.)

Вучням раздаюцца карткі з тэкстам:

> Маці зірнула ў акно. Яна запыталася ў Алеся:
>
> — Ад каго гэта твой сябар Мішка так ўцякае?
>
> Алесь падбег да акна:
>
> — Гэта, відаць, ён ішоў да мяне ў госці, убачыў каля дома суседскага Рэкса, спужаўся і пабег. Глянь, **як хутка ўцякае** (______________)! Пабягу яму на дапамогу, скажу, што Рэкс не пакрыўдзіць.

— Прачытайце размову маці з сынам. (Адзін з вучняў чытае тэкст.) Які выраз мог выкарыстаць Алесь замест слоў *хутка ўцякае*? Дапішыце гэты выраз у дужках. (Вучні самастойна запісваюць на картках фразеалагізм *толькі пяткі блішчаць*.) Падкрэсліце ў першым сказе дзейнік і выказнік.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Праца па падручніку.***

Практыкаванне 117.

— Прачытайце. Вусна вызначыце ў сказах галоўныя члены. (Вучні па чарзе знаходзяць граматычную аснову ў сказах.) На якія дзве групы можна падзяліць сказы? Давайце выпішам тыя з іх, у якіх акрамя дзейніка і выказніка ёсць іншыя словы. Які сказ запішам першым? (Вучань, які правільна называе першы сказ, выходзіць да дошкі і запісвае яго. Астатнія працуюць у сшытках.) Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік. Вусна пастаўце пытанні ад дзейніка і выказніка да іншых слоў у сказе. (Настаўнік звяртае ўвагу дзяцей на тое, што пры вызначэнні сувязі слоў у сказе спачатку ставяцца пытанні ад дзейніка да залежных слоў, а потым — ад выказніка.)

Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі сказамі практыкавання.

***2. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 74.

— Якія словы могуць быць у сказе акрамя дзейніка і выказніка?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 118.

— Вусна дапоўніце сказы даданымі членамі па пытаннях. Выкарыстайце словы для даведкі. (Вучні па чарзе дапаўняюць сказы даданымі членамі.) Давайце запішам сказы, якія ў нас атрымаліся. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія запісваюць сказы ў сшыткі.) Падкрэсліце ў сказах дзейнік і выказнік.

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 75.

— Якія словы ў сказе паясняюць даданыя члены?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

***4. Развіццё маўлення.***

— Раскажыце, куды б вы хацелі трапіць у час *асенніх канікулаў.* Якія тэатры, музеі вы ўжо наведалі? Што вам там найбольш спадабалася? (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 119.

— Прачытайце першы сказ. Назавіце ў ім галоўныя члены. (Адзін вучань чытае сказ і знаходзіць у ім граматычную аснову.) Вусна пастаўце па стрэлках пытанні да даданых членаў сказа. Зрабіце гэта ў той паслядоўнасці, якую падказваюць лічбы над стрэлкамі. (Аналагічная праца праводзіцца з другім і трэцім сказамі.) Запішыце адзін сказ на выбар. (Пасля запісу сказа праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***5. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што словы ў сказе звязаны па сэнсе. Каб устанавіць сувязь слоў у сказе, трэба ставіць пытанні ад аднаго слова да другога. Спачатку ставяцца пытанні ад дзейніка да даданых членаў сказа, якія ад яго залежаць, потым — ад выказніка.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі на с. 76.

**IV. Замацаванне.**

***Праца па падручніку.***

Практыкаванне 120.

— Разгледзьце малюнкі ў падручніку на с. 76. З дапамогай малюнкаў дапоўніце сказы даданымі членамі па пытаннях. (Вучні па чарзе называюць сказы, якія ў іх атрымаліся.) Разгледзьце схему сказа ўнізе старонкі. Колькі слоў у сказе, схема якога намалявана? Якія члены сказа ёсць у ім? На якое пытанне адказвае даданы член сказа, які паясняе дзейнік? На якое пытанне адказвае даданы член сказа, які паясняе выказнік? Падумайце і адкажыце, які са складзеных сказаў адпавядае схеме. (Вучань, які першым называе сказ *Маленькая дзяўчынка чытае кнігу*, выходзіць да дошкі і запісвае яго. Астатнія працуюць у сшытках. Пасля запісу сказа навучэнцы падкрэсліваюць у ім граматычную аснову, яшчэ раз вусна ставяць пытанні да даданых членаў сказа.)

Практыкаванне 121.

— Прачытайце першую скарагаворку. Назавіце ў ёй галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказе. (Аналагічная пра праводзіцца з другой скарагаворкай.) Разгледз це схему сказа, прапанаваную ў практыкаван Колькі слоў у сказе, схема якога намалявана? Я члены сказа ёсць у ім? На якое пытанне адказв даданы член сказа, які паясняе дзейнік? На якс пытанне адказвае даданы член сказа, які паясня выказнік? На якое пытанне адказвае даданы чле сказа, які паясняе іншы даданы член сказа? Паду майце і адкажыце, якая са скарагаворак адпавяда схеме. (Вучань, які называе другую скарагаворку выходзіць да дошкі і запісвае яе. Астатнія працуюць у сшытках.)

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 122.

— Прачытайце першую групу слоў. Разгледзьце першую схему сказа. Складзіце па схеме сказ. *(На праўдзе свет стаіць.)* (Аналагічная праца праводзіцца з другім сказам.) Як называюцца сказы, якія мы толькі што склалі? *(Прыказкі.)* Якіх людзей услаўляе першая прыказка? Калі праўда выклікае ў чалавека непрыемныя пачуцці?

Пры выканананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе запісаць прыказкі, якія мы толькі што склалі, і растлумачыць правапіс у словах выдзеленых літар.

**VI. Вынік урока.**

— З якіх членаў сказа можа складацца сказ? Пры адказе карыстайцеся схемай на форзацы падручніка. Што паясняюць даданыя члены ў сказе? Як знайсці ў сказе даданыя члены?

## Урок 24. Даданыя члены сказа

***Мэты:*** удасканальваць уменні вызначаць граматычную аснову і даданыя члены сказа, працаваць са схемамі сказаў; развіваць граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне, звязнае маўленне навучэнцаў; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** плакат з адлюстраваным на ім алгарытмам вызначэння сувязі слоў у сказе, карткі са словамі, што характарызуюць настрой чалавека.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце прыказкі, якія вы запісалі. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Змяніце слова *свет* так, каб замест [т] вымаўляўся [ц’]. Назавіце ў сказах галоўныя члены.

**II. Замацаванне.**

***1. Праца па падручніку.***

Практыкаванне 123.

— Давайце ўсе разам вызначым паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні сувязі слоў у сказе і складзём адпаведны алгарытм. Будзем карыстацца падказкамі з практыкавання.

— Прачытайце сказ пад пунктам 1. (Адзін з вучняў услых чытае сказ.) На якое пытанне адказвае слова *вечар*? Якім членам сказа яно з’яўляецца? Як падкрэсліваецца дзейнік у сказе? Назавіце першы крок у вызначэнні сувязі слоў у сказе. (Навучэнцы дапаўняюць сказы з пункта 1

патрэбнымі словамі: «*Знаходзім у сказе* ***дзейнік****. Падкрэсліваем яго* ***адной рыскай****»*.)

— Якія словы падкрэслены ў сказе пад пунктам 2? Пастаўце пытанне ад дзейніка да выказніка. Як падкрэсліваецца выказнік у сказе? Назавіце другі крок у вызначэнні сувязі слоў у сказе. (Навучэнцы дапаўняюць сказы з пункта 2 патрэбнымі словамі: *«Ставім пытанне ад дзейніка да* ***выказніка****. Падкрэсліваем выказнік* ***дзвюма рыскамі****».*)

— Да якога слова пастаўлена пытанне ў сказе пад пунктам 3? Які член сказа паясняецца словам *асенні*? Назавіце трэці крок у вызначэнні сувязі слоў у сказе. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 3 патрэбнымі словамі: *«Па пытаннях знаходзім дадзеныя члены сказа, якія паясняюць* ***дзейнік****».*)

— Да якога слова пастаўлена пытанне ў сказе пад пунктам 4? Які член сказа паясняецца словамі *на зямлю*? Назавіце чацвёрты крок у вызначэнні сувязі слоў у сказе. (Навучэнцы дапаўняюць сказ з пункта 4 патрэбнымі словамі: *«Па пытаннях знаходзім дадзеныя члены сказа, якія паясняюць* ***выказнік****».*)

— Пералічыце яшчэ раз паслядоўнасць дзеянняў пры вызначэнні сувязі слоў у сказе. (Адзін з вучняў узнаўляе алгарытм. Настаўнік вывешвае на дошку адпаведны плакат.)

— Давайце намалюем схему сказа, разбор якога рабілі. (Адзін вучань працуе каля дошкі, астатнія малююць схему сказа ў сшытках.)

***2. Развіццё маўлення.***

Практыкаванне 124.

— Разгледзьце рэпрадукцыю карціны беларускага мастака Віталя Цвірко «Вечар». Па якіх прыметах можна здагадацца, што аўтар адлюстраваў асенні вечар? *(Жоўтае лісце на дрэвах, жоўтая трава на лузе.)* Якія фарбы пераважаюць на карціне? *(Сінія, цёмна-зялёныя, жоўтыя.)*

На дошцы прымацоўваюцца карткі са словамі: сумны, задуменны, радасны, трывожны, добры, прыемны, цудоўны, спакойны.

— Прачытайце словы і выберыце тыя з іх, што дапамагаюць апісаць настрой, які стварае карціна. Што знаходзіцца ў цэнтры карціны? Дзе знаходзіцца вёска? Што цямнее за рэчкай?

— Прачытайце план. (Адзін з вучняў чытае ўслых.) Самастойна прачытайце словы і спалучэнні слоў, прапанаваныя ў практыкаванні. (Вучні чытаюць самі сабе.) На аснове рэпрадукцыі карціны апішыце асенні вечар па плане. Выкарыстайце спалучэннні слоў, якія толькі што прачыталі. Пачніце сваё апісанне сказам з папярэдняга практыкавання: *На зямлю апусціўся асенні вечар...*

Заслухоўваюцца тэксты, якія склалі 2–3 вучні. Выбіраецца і карэкціруецца лепшы варыянт.

— Давайце запішам тэкст, які ў нас атрымаўся. (Адзін з вучняў з каменціраваннем запісвае сказы тэксту на дошцы, астатнія працуюць у сшытках.)

Практыкаванне 125.

— Прачытайце сказы. Вусна вызначыце сувязь слоў у іх па пытаннях. (Вучні па чарзе зачытваюць сказы, знаходзяць у іх дзейнік і выказнік, ставяць пытанні да дадзеных членаў сказа.) Разгледзьце схему, прапанаваную пад лічбай 1. Якому сказу з практыкавання адпавядае схема? (Вучань, які першым правільна называе сказ, тлумачыць свой выбар.) Давайце запішам гэты сказ. (Вучань выходзіць да дошкі і запісвае сказ, астатнія працуюць у сшытках. Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі сказамі.) Прачытайце запісаныя сказы яшчэ раз. Што атрымалася ў выніку спісвання? *(Тэкст.)*

— Раскажыце пра наведаныя вамі выставы. Што было там асабліва цікавым?

Заслухоўваюцца выказванні некалькіх вучняў.

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 126.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам трэба будзе спісаць тэкст, вусна вызначыць сувязь слоў у сказах, намаляваць схему аднаго са сказаў тэксту. Акрамя гэтага, вам неабходна будзе падрыхтаваць адказы на пытанні па раздзеле «Сказ».

**IV. Вынік урока.**

— Раскажыце, у якой паслядоўнасці вызначаецца сувязь слоў у сказе. Выкарыстайце алгарытм, змешчаны на дошцы.

## Урок 25. Абагульненне па раздзеле «Сказ»

***Мэты:*** сістэматызаваць веды навучэнцаў па раздзеле «Сказ», адпрацоўваць уменні вызначаць тыпы сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыі, правільна інтанаваць іх, устанаўліваць сувязь слоў у сказе па пытаннях; развіваць граматычны лад маўлення, дапытлівасць навучэнцаў.

***Абсталяванне:*** плакат з адлюстраваным на ім алгарытмам вызначэння сувязі слоў у сказе, шары з лічбамі ад 1 да 10, аркушы з заданнямі кантрольнай работы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

Адзін з вучняў выходзіць да дошкі і малюе схему другога сказа тэксту. Астатнія навучэнцы па чарзе зачытваюць першы, трэці і чацвёрты сказы, называюць у іх граматычную аснову, вусна ставяць пытанні да дадзеных членаў сказа. Пасля гэтага ўвага дзяцей звяртаецца на другі сказ. Вучань каля дошкі вусна вызначае сувязь слоў у ім. Правяраецца правільнасць пабудовы схемы сказа на дошцы. Вучні параўноўваюць схему на дошцы са схемамі ў сшытках.

**II. Кантроль ведаў і ўменняў.**

***1. Падрыхтоўка да кантрольнай работы.***

— Зараз вам неабходна будзе даць адказы на пытанні па тэме «Сказ». Адгарніце падручнік на с. 84. Кожны вучань будзе адказваць на тое пытанне, нумар якога запісаны на шарыку. Шарыкі вы будзеце даставаць вось з гэтага мяшэчка. (Настаўнік дэманструе вучням мяшэчак, у якім ляжаць тэнісныя шарыкі з нумарамі ад 1 да 10.) Дакладна фармулюйце адказы на пытанні, сачыце за правільнасцю адказаў аднакласнікаў. Гэта дапаможа вам у далейшым выканаць заданні кантрольнай работы. (Вучні па чарзе дастаюць шарыкі з нумарамі з мяшэчка і адказваюць на адпаведныя пытанні.)

***2. Падзел на варыянты, інструктаж.***

Навучэнцам раздаюцца аркушы з заданнямі кантрольнай работы. Дзеці пад кіраўніцтвам настаўніка чытаюць кожнае заданне, паўтараюць, што і як трэба зрабіць.

**Кантрольная работа**

**Варыянт 1**

*1. Выразна прачытайце пытальныя сказы. Падкрэсліце пытальныя словы ў іх.*

Дзе жыве вугор?

Ці чулі вы пра рыбу, якая адпраўляецца ў падводны вырай?

Чаму вугор плыве ў Саргасава мора?

*Якім з гэтых сказаў трэба дапоўніць наступны тэкст:*

________________________________? Называецца яна вугор і здалёк падобная на вужаку. Вугор палюе на слімакоў, чарвякоў і дробных казюрак. Насыціцца і хаваецца пад корч у нару. А праз некалькі гадоў, нагуляўшы даволі тлушчу, ён плыве ў Балтыйскае мора, а потым — у Атлантычны акіян. Там вугор знаходзіць Саргасава мора, што раскінулася каля берагоў Амерыкі. У салёнай вадзе гэта рыба нерастуе. Празрыстыя ікрынкі паступова выспяваюць у малькоў, якія імкнуцца трапіць у тыя самыя рэкі і азёры, дзе выраслі іх бацькі.

*Паводле У. Ягоўдзіка* [2]

*Дапішыце патрэбны сказ у тэкст.*

*2. У кожнай групе сказаў знайдзіце лішні і падкрэсліце яго.*

1) Ці бачылі вы аленяў? Алені пасуцца на ўзлессі. Як называюць дзіцяня аленя?

2) Якія прыгожыя рогі ў аленяў! Іх рогі падобныя на дзівосныя кветкі. Як прыгожа скачуць алені!

3) Між дрэў ходзяць алені. Стой ціха і любуйся аленямі здалёк. Аленяня пасецца побач з аленіхай.

4) Тата, давай паедзем у Белавежскую пушчу. Хутчэй за вецер бегаюць гэтыя звяры! Дзядуля, раскажы мне пра аленяў.

*3. Прачытайце. Знайдзіце тыя сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца дзейнікамі. Падкрэсліце ў гэтых сказах дзейнік і выказнік.*

1) Мы прыйшлі на лясное **возера**. За вёскай раскінулася прыгожае **возера**.

2) Аленка глядзела на белыя **аблачынкі**. У небе плылі лёгкія **аблачынкі**.

3) **Вогнішча** паціху дагарала. Турысты расклалі вялікае **вогнішча.**

*4. Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.*

☐ На зямлю прабіліся кволыя прамяні асенняга сонца. *(Янка Галубовіч* [3, с. 87]*)*

☐ Пад вечар падзьмуў калючы сіверны вецер. *(Янка Галубовіч* [3, с. 91]*)*

☐ Дрэвы паціху скідваюць лісце. *(Янка Галубовіч* [3, с. 90]*)*

*Пастаўце рыску ў квадрацікy насупраць таго сказа, які адпавядае схеме:*




*5. Прачытайце іх сказы. Разгледзьце схемы да іх.*

1) Звонка заліваліся ў небе жаўранкі. *(Янка Галубовіч* [3, с. 102]*)*

2) Вялікае ружовае сонца паказалася з-за лесу. *(Янка Галубовіч* [3, с. 116]*)*

3) Падзьмуў моцны парывісты вецер. *(Янка Галубовіч* [3, с. 116]*)*




*Схема якога сказа намалявана няправільна? Запішыце гэты сказ. Самастойна намалюйце яго схему.*

**Варыянт 2**

*1. Выразна прачытайце пытальныя сказы. Падкрэсліце пытальныя словы ў іх.*

Калі ўзніклі мультфільмы?

Як ствараюцца мультфільмы?

Ці любіце вы мультфільмы?

*Якім з гэтых сказаў трэба дапоўніць наступны тэкст:*

________________________________? Першымі за стварэнне цуду бяруцца аўтары. Яны даюць ідэю, пішуць сцэнарыі. Пастаноўшчыкі пераносяць ідэю на паперу. Ад іх залежыць, як будуць выглядаць героі. Далей каманда аніматараў працуе над персанажамі — дадае колеры, ажыўляе іх. Перамалёўшчыкі перамалёўваюць створаныя карцінкі. Завяршае дзейства мантаж, калі выкідаюцца лішнія моманты, застаецца самае патрэбнае і прыгожае. Мультфільм гатовы. [4]

*Дапішыце патрэбны сказ у тэкст.*

*2. У кожнай групе сказаў знайдзіце лішні і падкрэсліце яго.*

1) Што такое выцінанка? Я люблю выразаць з паперы розныя фігуры. На ўроку малявання мы рабілі выцінанку.

2) Якія прыгожыя фігуркі выразалі дзеці! Выцінанка — гэта мастацтва вырабу ажурных узораў з паперы. Як цудоўна ўпрыгожаны вокны ў класе!

3) Вы можаце выразаць сняжынкі з паперы? Вазьміце аловак, нажніцы, паперу і зрабіце прыгожую сняжынку. Як вы ўпрыгожваеце клас да навагодняга свята?

4) Давайце ўсе разам упрыгожваць клас. Якія прыгожыя папяровыя сняжынкі атрымаліся ў вучняў! Зрабіце гірлянду з каляровых сняжынак.

*3. Прачытайце. Знайдзіце тыя сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца дзейнікамі. Падкрэсліце ў гэтых сказах дзейнік і выказнік.*

1) За акном ішоў **снег**. Андрэйка вельмі любіць **снег**.

2) **Поле** пабялела ад снегу. Лыжня праходзіць праз усё **поле**.

3) **Дрэва** трывожна зашумела ад ветру. Іней пабяліў **дрэва**.

*4. Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.*

☐ Дзяніска любіць восень. *(Таццяна Мушынская* [5, с. 40]*)*

☐ Дзяніска ўважліва слухае бабулю. *(Таццяна Мушынская* [5, с. 49]*)*

☐ Захапляльная гульня хутка скончыцца. *(Таццяна Мушынская* [5, с. 52]*)*

*Пастаўце рыску ў квадрацiку насупраць таго сказа, які адпавядае схеме:*




*5. Прачытай сказы. Разгледзьце схемы да іх.*

1) У вокнах запалілася святло. *(Таццяна Мушынская* [5, с. 103]*)*

2) Стаяў спякотны ліпеньскі дзень. *(Таццяна Мушынская* [5, с. 106]*)*

3) Па пакоях прагульваецца свежы ветрык. *(Таццяна Мушынская* [5, с. 106]*)*




*Схема якога сказа намалявана няправільна? Запішыце гэты сказ. Самастойна намалюйце яго схему.*

***3. Самаправерка напісанага.***

**III. Абагульненне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 127.

— Дапоўніце сказы тэксту дадзенымі членамі, што паясняюць дзейнік. Выкарыстайце словы для даведкі. (Вучні па чарзе чытаюць сказы, дапаўняюць іх патрэбнымі словамі.) Якога чалавека называюць цікаўным? Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні.

***2. Развіццё маўлення.***

— Зараз я задам пытанне для дапытлівых вучняў: ці ведаеце вы, чаму лятае паветраны шар? (Усе, хто жадае, выказваюць свае меркаванні.) Мы атрымалі некалькі розных адказаў на гэтае пытанне. Каб праверыць, які з іх правільны, вучні, якія лічаць сябе сапраўднымі знаўцамі паветраплавання, могуць выканаць заданне для эрудытаў на с. 81. Вам неабходна будзе вусна скласці працяг апавядання з практыкавання 127 і расказаць, што паведаміў Дашы тата. Патрэбныя звесткі пра палёт паветранага шара вы зможаце знайсці ў дзіцячай энцыклапедыі або ў інтэрнэце.

***3. Праца з рубрыкай «Гаварыце правільна!».***

— Прачытайце спалучэнні слоў у рубрыцы на с. 81. Ці ўсе яны вам зразумелыя? Вусна адкажыце на наступныя пытанні: якую цікавую кнігу вы нядаўна чыталі? Якую дзяўчынку можна назваць цікаўнай? Якія пытанні часта цікавяць дзяцей? Якім пытаннем вы зацікавіліся сёння на ўроку? (Вучні па чарзе адказваюць на пытанні настаўніка, выкарыстоўваючы спалучэнні слоў з рубрыкі.)

Практыкаванне 128.

— Прачытайце незакончаныя сказы. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. Як вы думаеце, якое заданне трэба сфармуляваць да практыкавання? (Заслухоўваюцца меркаванні розных вучняў. Выбіраецца і абгрунтоўваецца правільны адказ: дапоўніце сказы тэксту дадзенымі членамі, што паясняюць выказнік. Вучні па чарзе вусна дапаўняюць сказы патрэбнымі словамі.) Самастойна запішыце сказы, якія ў вас атрымаліся. (Пасля запісу праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***4. Развіццё маўлення.***

— Раскажыце, што вы любіце рабіць, калі ідзе першы снег. (Заслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 129.

— Прачытайце скорагаворкі. Вызначыце сувязь слоў у сказах. Карыстайцеся плакатам на дошцы. (Вучні па чарзе вызначаюць сувязь слоў у сказах.) Разгледзьце схему сказа, прапанаваную ў практыкаванні. Якому сказу адпавядае схема? *(Першаму.)* Схема якога сказа не намалявана? Самастойна намалюйце яго схему. (Пасля выканання задання вучнямі настаўнік прапаноўвае на дошцы гатовую схему. Вучні суадносяць самастойна пабудаваныя схемы са схемай на дошцы.) Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць другую скорагаворку.

Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка скорагаворкі.

Практыкаванне 130.

— Прачытайце першую групу слоў. Разгледзьце першую схему сказа. Складзіце па схеме прыказку. *(Добрае слова не забываецца.)* (Аналагічная праца праводзіцца з другім сказам.) Чаму так гавораць? У якой з прыказак дадзены член сказа паясняе дзейнік, а ў якой — выказнік? Запішыце адну прыказку на выбар.

**IV. Дамашняе заданне.**

Варыянты:

1) Практыкаванне 131.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам трэба будзе спісаць сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст, знайсці ў тэксце сказ, які адпавядае прапанаванай схеме, і падкрэсліць у ім галоўныя члены. Загаловак, які вы падбераце да тэксту, запісваць не трэба.

2) Творчае заданне з практыкавання 127.

**V. Вынік урока.**

На дошцы зроблены запіс:

*Сказ выражае закончаную думку.*

— Выразна прачытайце сказ, запісаны на дошцы. Вызначыце тып сказа па мэце выказвання. Вымавіце гэты сказ так, каб з апавядальнага ён ператварыўся ў пытальны. Які знак прыпынку трэба паставіць у канцы пытальнага сказа? Вызначыце сувязь слоў у сказе па пытаннях. Пры выкананні якіх заданняў узніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб з лёгкасцю выканаць гэтыя заданні?

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Часопіс «Вясёлка». — 2010. — № 2. — С. 14.
2. *Ягоўдзік, У.* Год-карагод : апавяданні і мініяцюры : для мал. і сярэд. шк. узросту / Уладзімір Ягоўдзік ; фота С. Чарапіцы. — Мінск : выдавец М. Ягоўдзік, 2013. — 160 с.
3. *Галубовіч, І. І.* Вавёрчыны кватаранты : апавяданні і казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Янка Галубовіч ; маст. Н. А. Чарапанава. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. — 160 с. : іл.
4. Часопіс Вясёлка. — 2016. — № 6. — С. 15.
5. *Мушынская, Т. М.* Вожыкі ў футбол гуляюць : вершы, апавяданні, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Таццяна Мушынская ; мастак Г. С. Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Литература и искусство, 2008. — 136 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://900igr.net/datal/okruzhajuschlj-mir/Dikij-mir-zhivotnykh/0023-025-Letom-mekh-u-belki-redkij-i-ryzhij.jpg; http://www.zooclub.ru/skat/img.php?w=700&h=700&img=./attach/fotogal/oboi/birds/33.jpg; http://kiop911.ru/wp-content/uploads/2015/01/gnezdo-shershnej-foto-21.jpg

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

**Выкладчык, выпускнік факультэта пачатковай адукацыі БДПУ**

**1957** факультет педагогики и методики начального обучения МГПИ

**60 лет**

**2017** факультет начального образования БГПУ

Шаноўныя калегі!

Сардэчна віншуем з юбілейнай датай кіраўніцтва, калектыў выкладчыкаў, студэнтаў, выпускнікоў факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і ўсіх тых, чый жыццёвы шлях быў звязаны з гэтай установай! Пачатковая адукацыя — падмурак адукаванасці, а настаўнік пачатковых класаў — той чалавек, які закладвае ў асобе вучня веру ў поспех, імкненне да пазнання і з'яўляецца прыкладам у стаўленні да жыцця, людзей, працы. На працягу 60-ці гадоў змяняліся пакаленні выкладчыкаў і студэнтаў, але ўвесь гэты час факультэт пачатковай адукацыі вырашае важную дзяржаўную задачу па падрыхтоўцы педагогаў-прафесіяналаў. Ваша праца спрыяе захаванню лепшых традыцый педагогікі, навуковаму пошуку на ніве пачатковага навучання, з'яўленню метадычных адкрыццяў і знаходак. Асабліва вітаем з нагоды юбілею факультэта тых супрацоўнікаў, якія з'яўляюцца аўтарамі вучэбных дапаможнікаў для пачатковых класаў, выступаюць у якасці рэцэнзентаў вучэбных выданняў, працуюць у складзе секцыі пачатковай адукацыі. Спадзяёмся на далейшае прыемнае і плённае супрацоўніцтва з факультэтам пачатковай адукацыі ў правядзенні экспертызы вучэбных выданняў. Будзем шчыра рады бачыць вас у складзе аўтарскіх калектываў новых вучэбных дапаможнікаў. Жадаем вашай згуртаванай камандзе аднадумцаў здароўя, добрага настрою, творчых поспехаў, новых вышынь і прафесійнага задавальнення! Паважаныя калегі, заставайцеся заўсёды прывабнымі, мудрымі, сапраўднымі майстрамі сваёй справы!

*З павагай калектыў аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі*

Дорогие друзья, коллеги, студенты!

60 лет, пройденные факультетом начального образования, — это бесконечная череда многих трудных и прекрасных дел, это яркая дорога в будущее, начинающаяся с Любви, Терпения, Понимания — основных учительских качеств, с которыми вот уже более полувека приходят к детям его выпускники.

Пожалуй, нет в столице ни одной гимназии или школы, где бы ни трудились ваши выпускники. И все наши знаменитые соотечественники — депутаты и учёные, художники и поэты, труженики полей и руководители учреждений — прошли через их добрые руки. Потому что нет ни одного специалиста, который не учился бы в первом классе, не вспоминал с благодарной нежностью свою первую учительницу. Это ваши бывшие студенты помогли им стать достойными гражданами нашей страны, её опорой, её элитой...

И сегодня все они, многочисленные ученики ваших выпускников, присоединяются к нашим поздравлениям. Мира вам, добра, любви и счастья! Не забывайте, что ваша профессия — самая важная, самая нужная, самая великая. Пока будут живы учителя — будет жив духовный потенциал нашей страны!

С праздником!

*Отдел начального образования ГУО «Минский городской институт развития образования»*